# Песня неўміручая

**Абласная навуковая бібліятэка імя Яўхіма Карскага днямі прымала шматлікіх гасцей. Постаці класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа былі ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў навукова-практычнай канферэнцыі «Нацыянальны гонар Беларусі».**

Не так даўно ў прэстыжна-папулярнай серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» ўбачыла свет выданне пра Янку Купалу. А ўсяго некалькі дзён таму ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла кніга пра Якуба Коласа. Яна яшчэ пахне свежай друкарскай фарбай і ўжо стаіць на паліцы выдатнай кніжнай выставы «Летапісцы свайго народа», падрыхтаванай да юбілейнай канферэнцыі. Побач – апошнія факсімільныя выданні «Шляхам жыцця» Янкі Купалы і «Сымон-музыка» Якуба Коласа, аддрукаваныя ў 1925-м і 1912-м гадах. Ёсць падарункавыя і кішэнныя фаліянты, асобныя творы і шматтомнікі, прадстаўлены музычныя і мастацкія выявы, якія ўслаўляюць песняроў.

– Так трапна і сакавіта, як яны апісвалі ў сваіх неўміручых творах вёску, сялянскі побыт, жніво, поле, не змог занатаваць ніхто з беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, – адзначыў, адкрываючы мерапрыемства, начальнік упраўлення культуры аблвыканкама Аляксандр Вярсоцкі. А загадчыца бібліятэкі Лідзія Мальцава прыгадала школьныя ўрокі і напеўныя радкі неўміручай паэмы «Новая зямля», па якой мы вывучалі родную мову, знаёміліся з творчасцю Коласа.

Тое, што класікаў беларускай літаратуры добра ведаюць за мяжой і ўшаноўваюць памяць аб іх беларусы Польшчы, пераканаўча пацвердзілі старшыня праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў рэспубліцы-суседцы Ян Сычэўскі і доктар гуманітарных навук універсітэта ў Беластоку Гражына Міхей-Харытанюк. Абодва засведчылі, што нават зараз у Польшчы перакладаюць творы Купалы і Коласа.

Кандыдат філалагічных навук, прафесар ГрДУ імя Янкі Купалы Аляксей Пяткевіч – зямляк Якуба Коласа, чым і ганарыцца. Ён дакладна ведае, калі і з якой нагоды знакамітыя беларускія паэты наведвалі Гродзеншчыну. Напрыклад, да вайны ў Гродне жыў сваяк Купалы Вікенцій Станкевіч, і пісьменнік у яго, здаралася, гасцяваў. У даваенным Слоніме ён сустракаўся з вядомым паэтам Заходняй Беларусі Гальяшам Леўчыкам (дарэчы, у музеі нашай рэдакцыі ёсць старынны музычны інструмент, на якім у 30-я гады мінулага стагоддзя іграў Гальяш). Якуб Колас бываў у Ваўкавыску і Навагрудку. На радзіме Адама Міцкевіча ў 1940 годзе наведаў музей паэта і нават пакінуў свой водгук. Прафесар Пяткевіч узгадаў той час, калі яму, дэпутату абласнога Савета, давялося прыкласці шмат намаганняў, каб адна з магістральных вуліц Гродна насіла імя класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы.

Удзельнікі канферэнцыі нібыта пабывалі ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы і Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа. Відэаэкскурс правялі навуковыя супрацоўнікі гэтых устаноў. Цікава было даведацца, што верш Янкі Купалы «А хто там ідзе?» перакладзены на 85 моў свету і менавіта Купала першым сярод беларускіх паэтаў пачаў ствараць санеты. Прыемна было не толькі пачуць, што радуюць ураджаямі яблыні, набіраюць моц дубы, пасаджаныя Якубам Коласам, але і ўбачыць, як разрасліся і цвітуць у яго садзе блакітныя незабудкі…

Шмат захапляючага, раней невядомага пра паэтаў прагучала з вуснаў вучоных універсітэта імя Янкі Купалы – Ігара Жука, Святланы Тарасавай, Дзмітрыя Лебядзевіча, Уладзіміра Каялы, Алы Петрушкевіч, Алены Руцкой і іншых удзельнікаў мерапрыемства.

Уразіла выступленне ўнучкі Якуба Коласа Веры Міцкевіч: як жыў, ствараў, перамагаў боль, радаваўся ўнукам Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч. Хоць яна і нарадзілася пасля смерці знакамітага дзядулі, шмат ведае ад свайго бацькі – Данііла Міцкевіча, арганізатара і першага дырэктара Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, заслужанага дзеяча культуры Беларусі. Вера Даніілаўна ўзгадала, як паэт усё сваё жыццё верыў у цуд, марыў, што дачакаецца сына Юрку, які пайшоў на вайну і не вярнуўся; як сачыў за надвор'ем, хваляваўся за пасевы, любіў сустракаць гасцей, збіраць грыбы…

У рамках міжнароднай канферэнцыі атрымалі ўзнагароды пераможцы літаратурнага конкурсу «Песняры роднай зямлі». Адбыўся святочны канцэрт і тэатралізаванае прадстаўленне неўміручай «Паўлінкі». Прайшлі ўрок-прэзентацыя «Заўсёды з намі Колас і Купала» і слайд-вечарына «Свет кахання і дабрыні», іншыя цікавыя мерапрыемствы.

**Святлана МУРЫНА**